4. *Татур, Г. Х.* Очерк археологических памятников на пространстве Минской губернии и ее археологическое значение. – Минск, Губернская типография, 1892.
5. *Шпилевский, П. М.* Путешествие по Полесью и белорусскому краю / П. М. Шпилевский ; предисл., состав. С. А. Кузняева. – 2-е изд. – Минск : Полымя, 2004. – 251 с.

## КРЫНІЦЫ ДАСЛЕДАВАННЯ АРГАНІЗАЦЫІ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ ПАРТЫЗАН НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

***С. А. Пацыенка,***
*кандыдат культуралогіі,*
*дацэнт кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў»*

З першага дня вайны насельніцтва Беларусі прымала актыўны ўдзел у барацьбе з захопнікамі, а сама тэрыторыя краіны ператварылася ў арэну вайсковых дзеянняў. Бессмяротны подзвіг здзейснілі абаронцы Брэсцкай крэпасці, Мінскага ўмацаванага раёна, мужна змагаліся ваяры на рубяжы ракі Бярэзіна ў раёне Барысава і Бабруйска, на Віцебскім напрамку ў раёне Лепель – Сенна, пад Гомелем і ў іншых мясцінах.

З першых і да апошніх дзён акупацыі на тэрыторыі краіны вялася актыўная партызанская барацьба. Нездарма Беларусь пачалі тады называць «рэспублікай-партызанкай». Усяго за ваенны перыяд партызанская армія Беларусі налічвала больш за 370 тысяч удзельнікаў, «аб’яднаных у 1255 атрадаў, з іх 997 уваходзілі ў склад 213 брыгад і палкоў, 258 змагаліся самастойна, звыш 400 тысяч чалавек складалі партызанскія рэзервы» [9, с. 137].

Значную ролю ў патрыятычным выхаванні партызан і насельніцтва краіны адыграла мастацкая творчасць. Нягледзячы на складаныя ўмовы, яна атрымала на акупіраванай тэрыторыі шырокае распаўсюджанне.

Пытанне арганізацыі мастацкай творчасці партызан і насельніцтва акупіраванай фашыстамі тэрыторыі асвятлялася пераважна ў кантэксце агульнай гісторыі вайны. Сярод публікацый, якія ўтрымліваюць інфармацыю ўзгаданай тэматыкі, можна назваць такія фундаментальныя абагульняючыя працы, выдадзеныя ў 60–80-я гг. XX ст., як 6-томная «История Великой Отечественной войны Советского Союза» (1960–1965) [6] ці 12-томная «История Второй мировой войны» (1973–1982) [7]. Апісанне асобных кірункаў культурна-адпачынкавай дзейнасці ў гады



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вайны, яе значэнне ў ідэалагічным выхаванні партызан і насельніцтва, асобныя прыклады выкарыстання друку і радыё ў мастацкіх мэтах, узоры вуснай прапаганды, апісанне прыкладаў арганізацыі мастацкай самадзейнасці ўтрымліваюцца ў 8-м томе «Белорусской Советской энциклопедии» [2], у трохтомніку «Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков» [3] і інш.

Значным унёскам у вывучэнне арганізацыі мастацкай творчасці партызан у гады вайны з’явілася даследаванне А. І. Залескага, у якім прыводзяцца прыклады выкарыстання разнастайных форм і метадаў культурна-адпачынкавай дзейнасці ў патрыятычным выхаванні беларускага сялянства ў гады Вялікай Айчыннай вайны [4]. Пэўную цікавасць прадстаўляе работа А.Ф. Юдзянкова, у якой аўтар даследаваў асноўныя сродкі і формы культурна-адпачынкавай дзейнасці ў часова акупіраваных раёнах СССР [16].

У працах шэрагу аўтараў даследуюцца асаблівасці падпольнага і партызанскага друку. Так, у гістарычным нарысе С. В. Марцэлева разглядаецца выданне газет на часова акупіраванай фашыстамі тэрыторыі рэспублікі і ў савецкім тыле [10]. Інфармацыю аб выданні і ідэйна-тэматычным змесце партызанскіх рукапісных часопісаў, іх ролі ў ідэалагічным выхаванні «народных мсціўцаў», як называлі партызан, можна знайсці ў працы Г. Д. Кнацько «Рукописные издания партизан Белоруссии» [8]. Распаўсюджанню кніг, газет і лістовак сярод партызан і насельніцтва, іх уплыву на развіццё партызанскага руху ў рэспубліцы прысвечана дысертацыя С. А. Паўлавай [11].

Даследаванню арганізацыі мастацкай творчасці ў гады вайны прысвечаны работы А. П. Багрова, І. Д. Гутарава, Л. С. Мухарынскай, Р. Ф. Шауры і інш. Значны ўнёсак у даследаванне арганізацыі мастацкай творчасці партызан у гады вайны зрабіў выкладчык Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Аляксандр Міхайлавіч Пацыенка. У 1985 г. ён абараніў дысертацыю на суісканне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук на тэму «Культурно-просветительная работа в партизанских краях и зонах Белоруссии в годы Великой Отечественной войны». Яго аўтарству належыць шэраг публікацый, якія закранаюць розныя аспекты арганізацыі мастацкай творчасці ў ваенны перыяд («Выхаванне дзяцей і падлеткаў у партызанскіх «лясных школах» у гады Вялікай Айчыннай вайны» (у суаўтарстве з С. А. Пацыенка), «Мастацкая творчасць партызан і насельніцтва Беларусі ў час яе акупацыі фашыстамі», «Вокам» партызанскай перасоўкі: кінаабслугоўванне на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны») [12–14] і інш.

Найбольш поўнае і ўсебаковае асвятленне партызанскай барацьбы, пытанняў побыту і культуры паўсядзённасці партызан утрымліваецца ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зборніках артыкулаў кіраўнікоў партызанскага руху Беларусі, партызан і падпольшчыкаў. Такія зборнікі былі выдадзены па Баранавіцкай, Брэсцкай, Вілейскай, Гомельскай, Гродзенскай і іншых абласцях. Аднак вышэй названыя крыніцы даюць дастаткова разрозненыя звесткі аб арганізацыі мастацкай творчасці ў тыле ворага, толькі часткова асвятляюць тую ролю, якую яна адыграла ў працэсе фарміравання свядомасці партызан і насельніцтва акупіраванай Беларусі, у мабілізацыі людзей на адпор ворагу.

Каштоўнымі крыніцамі з’яўляюцца архіўныя матэрыялы, якія захоўваліся ў Партыйным архіве Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, Цэнтральным дзяржаўным архіве Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР, архівах Інстытута гісторыі і Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклора АН БССР і інш. Сёння матэрыялы па гісторыі партызанскага руху захоўваюцца ў фондах разнастайных дзяржаўных і ведамственных архіваў, Беларускім Дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, краязнаўчых музеях, музеях народнай славы і інш. Напрыклад, у фондах музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны захоўваецца найбольш поўны ў Беларусі збор рукапісных партызанскіх часопісаў (248 адзінак). Менавіта гэты збор у 2019 г. лёг у аснову сумеснага праекта «БЕЛТА» і Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны «Партызанскі летапіс».

Асобныя пытанні арганізацыі мастацкай творчасці партызан асвятляюцца ў шэрагу дакументальных крыніц, сярод якіх: зборнікі дакументаў і матэрыялаў перыяду Вялікай Айчыннай вайны; матэрыялы Савецкага інфармацыйнага бюро; зборнікі лістовак, дакументаў і матэрыялаў па партызанскім руху на Беларусі; статыстычныя зборнікі, а таксама дакументы аб стратах, нанесеных культуры і народнай гаспадарцы і інш.

Каштоўныя звесткі па арганізацыі мастацкай творчасці партызан у гады вайны можна знайсці ў мемуарнай літаратуры. Яе аўтары, былыя ўдзельнікі партызанскага руху, прыводзяць цікавыя звесткі, дзеляцца ўспамінамі і асабістымі пачуццямі. З твораў мемуарнай літаратуры асаблівай увагі заслугоўваюць успаміны А. Ю. Дзенісевіча, В. І. Казлова, П. З. Калініна, В. І. Лівенцава, К. Т. Мазурава, М. С. Пруднікава, Ф. Д. Роммы, М. І. Шчансновіча, Д. В. Цябута і інш. [15]. Шмат фактаў зафіксавана ў гутарках з кіраўнікамі партызанскага руху і арганізатарамі культурна-адпачынкавай дзейнасці (размовы з І. Ц. Зуевічам, І. Ф. Клімавым, Р. Н. Мачульскім, А. С. Мікалаевым, І. І. Насевічам, Г. А. Храмовічам і інш.). Дадатковымі крыніцамі інфармацыі з’яўляюцца рэпертуарныя матэрыялы партызанскай мастацкай творчасці, фотаздымкі арганізатараў і ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці, іх выступленняў і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, даследаванне асаблівасцей арганізацыі мастацкай творчасці партызан і насельніцтва Беларусі ў гады вайны грунтуецца на шэрагу архіўных, дакументальных, мемуарных, літаратурных і іншых крыніц. Толькі шматбаковае вывучэнне разнастайных крыніц можа дазволіць аднаўленне цэласнай карціны існавання культурнага жыцця грамадства ў такі складаны перыяд, як гады Вялікай Айчыннай вайны. Даследаванне арганізацыі мастацкай творчасці партызан мае важнае значэнне ў кантэксце даследаванняў як гісторыі культурна-адпачынкавай дзейнасці на тэрыторыі Беларусі, так і гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў цэлым.

---

*1.* Беларусь. 1941–1945: Подвиг. Трагедия. Память : в 2 кн. / НАН Беларуси, Ин-т истории ; редкол.: А. А. Коваленя (пред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2010 – Кн. 2 – 358 с.

*2.* Белорусская Советская энциклопедия : В 12 т. / Галоўны рэд. БелСЭ ; рэдкалегія: П. У. Броўка (галоўны рэд.). – Т. 8. – Минск : АН БССР, 1976. – 675 с.

*3.* Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : в 3 т. / Гл. редкол.: А. Т. Кузьмин (пред.) и др. – Минск : Беларусь, 1983–1985.

*4. Залесский, А. И.* В партизанских краях и зонах: патриотический подвиг советского крестьянства в тылу врага (1941–1944 гг.) / А. И. Залесский. – М. : Соцэкгиз, 1962. – 397 с.

*5. Здановіч, У. В.* Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. Агляд крыніц і айчыннай гістарыяграфіі : манаграфія / У. В. Здановіч ; навук. рэд. А. А. Каваленя ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ, 2012 – 283 с.

*6.* История Великой Отечественной войны Советского Союза. 1941–1945 гг. : в 6 т. / Ред. комис. П. Н. Поспелов (пред.) и др. – М. : Воениздат, 1960–1965.

*7.* История Второй мировой войны 1939–1945 гг. : в 12 т. / Гл. ред. комис. А. А. Гречко (пред.) и др. ; Ин-т воен. истории М-ва обороны СССР, Ин-т марксизма-ленинизма при ЦК КПСС, Ин-т всеобщей истории АН СССР. Ин-т истории СССР АН СССР. – М. : Воениздат, 1973 – 1982.

*8. Кнатько, Г. Д.* Рукописные издания партизан Белоруссии / Г. Д. Кнатько. – Минск : Наука и техника, 1979. – 86 с.

*9. Коваленя, А. А.* Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны) / Под ред. А. А. Ковалени, Н. С. Сташкевича, пер. с бел. яз. А. В. Скорохода. – Минск : Изд. Центр БГУ, 2004. – 279 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*10. Марцелев, С. В.* Печать Советской Белоруссии: исторический очерк / С. В. Марцелев. – Минск : Беларусь, 1967. – 512 с.

*11. Павлова, С. А.* Книга и чтение в жизни партизан Белоруссии: дисс. ... канд. филол. наук: 05.25.04. / С. А. Павлова. – Ленинград, 1983. – 214 с.

*12. Пацыенка, А.М.* Мастацкая творчасць партызан і насельніцтва Беларусі ў час яе акупацыі фашыстамі / А. М. Пацыенка // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў. – 2005. – № 4. – С. 73–78.

*13. Пацыенка, А. М.* «Вокам» партызанскай перасоўкі: кінаабслугоўванне на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны / А. М. Пацыенка // Культура. – 2009. – № 18. – С. 16.

*14. Пацыенка, А. М.* Выхаванне дзяцей і падлеткаў у партызанскіх «лясных школах» у гады Вялікай Айчыннай вайны / А. М. Пацыенка, С. А. Пацыенка // Адукацыя і выхаванне. – 2009. – № 5. – С. 76–79.

*15. Сченснович, Н. И.* Записки актера и партизана / Н. И. Сченснович; Литературная подготовка текста Алексея Кейзарова. – Минск : Беларусь, 1976. – 152 с.

*16. Юденков, А.Ф.* Политическая работа партии среди населения оккупированной советской территории (1941–1944) / А. Ф. Юденков. – М. : Мысль, 1971. – 360 с.

## ВАЙНА ПРАЗ ПРЫЗМУ МАЛАДОСЦІ: ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ ВОБРАЗНЫМ СЛОВАМ

***А. М. Пісарэнка,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры беларускай і замежнай філалогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

***В. С. Варапаева,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт, прафесар кафедры беларускай і замежнай філалогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

Сямідзесяцігоддзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне – дата надзвычай хвалюючая і трапяткая для многіх народаў свету, і асабліва для нас, беларусаў. З гэтай вайны не вярнуліся многія, і нашчадкі ўвекавечваюць памяць у творах розных відаў мастацтва, у назвах вуліц, і як пацверджанне гэтаму – помнік у горадзе Жодзіна: маці развітваецца з сынамі, якія ідуць на вайну. Ніводзін з іх не вярнуўся, і такіх недачаканых шмат. Што іх, юных і маладых хлопцаў і дзяўчат, цягнула на гэтую

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ